ЗАЦВЯРДЖАЮ

Старшыня выканкома гарсавета

М.МарынІч

"___" лІстапада 1990 г.

П Л А Н

мерапрыемствау выканкома гарсавета па рэалІзацыІ
Закона БССР "Аб мовах у Беларускай ССР"

1. Забяспечыць растлумачэнне Закона "Аб мовах у Беларускай ССР", пераканауча давесцІ да вучняу, студэнтау,І грамадскасцІ неабходнасць ведання беларускай мовы, як асновы духоунага узаемнаразумення, культурнага узбагачэння, нацыянальнай самасвядомасцІ.

Установіць с гэтай мэтай цесныя кантакты з гарадской арганІзацыяй Таварыства беларускай мовы Імя Ф.Скарыны, творчымІ саюзамІ І Іншымі грамадскІмІ арганІзацыямІ.

1990-1991 г. — Упрауленне народнай адукацыІ, упрауленне культуры,райвыканкомы

2. ПрааналІзаваць моуны рэжым ва усІх тыпах навучальных установ, Іх адпаведнасць нацыянальнаму складу І запатрабаванням насельнІцтва.

Да 2000 года прывесцІ у адпаведнасць с нацыянальным складам насельнІцтва горада колькасць вучняу, якІя навучаюцца на беларускай мове, колькасць беларускІх дзіцячых садоу, груп І класау у дашкольных, сярэднІх спецыяльных установах, школах І ПТВ.

1990-1991 г. — Упрауленне народнай адукацыІ, райвыканкомы, раённыя аддзелы народнай адукацыІ

3. ПеравесцІ дашкольныя установы І большасць сярэднІх школ, школы-Інтэрнаты на беларускую мову навучання І выхавання у адпаведнасцІ з нацыянальным складам насельнІцтва горада.

1991-2000 г. — упрауленне І аддзелы народнай адукацыІ, райвыканкомы

4. Адкрыць БеларускІ лІцэй для дзяцей, якІя маюць лІнгвІстычныя здольнасцІ ІлІтаратурныя задаткІ. Прадугледзіць стварэнне беларускІх гІмназІй, лІцэяу у кожным раёне горада.

1990-1995. — упрауленне І аддзелы народнай адукацыІ, райвыканкомы



5. ПавялІчыць колькасць класау з паглыбленым вывучэннем беларускай мовы І лІтаратуры, укамплектаваць Іх высокакваліфікаванымІ кадрамІ, вучэбнай І метадычнай лІтаратурай.

1990-1995 г. — Упрауленне І аддзелы народнай адукацыІ

6. Ажыццявіць паступовы пераход прафтэхвучылІшч на беларускую мову навучання, у першую чаргу перавесцІ на беларускую мову ПТВ, рыхтуючыя кадры для гандлю, грамадскага харчавання, бытавога абслугоування. Ва усІх ПТВ машынабудавання, лёгкай прамысловасцІ, бытавога абслугоування адкрыць аддзяленнІ для навучання на беларускай мове па прыярытэтных прафесІях.

да 2000 г. — Упрауленне народнай адукацыІ

7. АрганІзаваць навучальна-метадычнае забяспячэнне навучальных установ па актуальным пытанням выкладання беларускай мовы І лІтаратуры.

Распрацаваць Інтэнсіуную методыку навучання беларускай грамаце на падставе методыкІ Зайцава.

1991-1992 г. — Упрауленне народнай адукацыІ, гарадскІ Інстытут удасканалення настаунІкау

8. АрганІзаваць на базе навучальных установ, пры МІнскай фІрме "Радуга", пастаянна дзеючыя курсы па практычнаму авалоданню насельнІцтвам беларускай мовай, на гаспадарчым разлІку

1991-1995 г. — Упрауленне народнай адукацыІ І бытавога абслугоування, райвыканкомы

9. ВыявІць патрэбу у спецыялІстах аддзелау, упраулення у, служб гарвыканкома І райвыканкома, якІя павІнны валодаць беларускай мовай І у залежнасцІ ад ведау, арганІзаваць курсы па вывучэнню беларускай мовы для розных катэгорый работнІкау. Вызначыць парадак адкрыцця курсау І крынІцы фІнансавання.

1990-1991 г. — Аддзел па працы І сацыяльным пытанням, фІнансавае упрауленне

10. Забяспечыць афармленне тапанІмІчных назвау (адмІнІстрацыйна-тэрытарыяльных адзІнак, вулІц, плошчау І т.д.), назвау установ, прадпрыемствау І арганІзацый, а таксама выданняу Інфармацыйнага І рэкламнага характару на беларускай мове.

1990-1993г. — ГлауМІнскархІтэктура, упрауленне

дарожна-маставога будаунIцтва I добраупарадкавання, райвыканкомы, упрауленнI культуры I прадпрыемствау камунальнага абслугоування

II. Адкрыць гарадскI цэнтр прапаганды I развIцця беларускай культуры, свят I традыцый.

1992 г. — Упрауленне культуры

I2. Забяспечыць пракат мастацкIх фIльмау на нацыянальнай мове кIнастудыI "БеларусьфIльм" у гарадскIх кIнатэатрах.

Пачыная з I99I г. пастаянна — Упрауленне культуры

I3. АжыццявIць пераход к дзейнасцI упрауленняу, аддзелау I служб гарвыканкома, райвыканкомау на вядзенне спрау на беларускай мове I яе шырокае выкарыстанне у зносIнах з грамадзянамI.

I990-I993г. — УпрауленнI, аддзелы I службы гарвыканкома, райвыканкомы

Выканаць пячаткI, штампы, фармуляры, афIцыйныя бланкI на беларускай мове I прыняць неабходныя меры па пераабсталяванню пIшучых машынак на беларускI шрыфт.

I99I г. — Агульны аддзел, упрауленнI, службы гарвыканкома, райвыканкомы